22. Государственный архив Гродненской области (ГАГр). – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 10/1.
23. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 1. – Д. 46.
24. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 3. – Д. 25.
25. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 1. – Д. 49.
26. ГАГр. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 105.
27. ГАГр. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 85.
28. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 2. – Д. 21.
29. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 2. – Д. 8.
30. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 1. – Д. 39.
31. ГАГр. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 77.

**(Дата подачи: 16.02.2018 г.)**

*В. В. Волкава*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*V. Volkava*
Republican Institute of Higher Education, Minsk

**УДК [94(476) + 338.22(=112.2)(476)(091)]«1915/1918»**

# АКУПАЦЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ НЯМЕЦКІХ ГІСТОРЫКАЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД

# THE OCCUPATION OF BELARUS DURING WORLD WAR I IN THE WORK OF THE GERMAN HISTORIAN: HISTORIOGRAPHICAL REVIEW

*Праводзіцца аналіз нямецкамоўнай навуковай літаратуры аб акупацыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Аўтар прыходзіць да высновы, што нямецкая акупацыя найбольш актыўна даследавалася ў перыяд самой вайны і ў першыя гады пасля яе. Другая хваля цікаўнасці даследчыкаў да тэмы звязана з падрыхтоўкай Другой сусветнай вайны. Змена парадыгмы вывучэння вайны толькі з боку ваеннай гісторыі да вывучэння пытанняў функцыянавання грамадства і штодзённага жыцця насельніцтва ў ваенны час звязана з кнігай Ф. Фішэра (1960-я). Характэрнай асаблівасцю сучаснай нямецкай гістарыяграфіі сталі калектыўныя працы. Беларускія тэрыторыі падчас Першай сусветнай вайны застаюцца па-за межамі навуковай цікаўнасці даследчыкаў Германіі.*

*Ключавыя словы: Першая сусветная вайна; гістарыяграфія; немецкая ўсходняя палітыка; нямецкая акупацыя; Обер Ост; ваенныя адміністрацыі «Літва» і «Беласток – Гродна».*

*The author addresses the work of the German historians about the occupation of Belarus during World War I. She comes to conclusion that the German occupation was most actively researched during the period of war and first post-war years. The second wave of researches interest was triggered by the World War II preparations. The switch of the scope of war research from military history to social structures and the history of everyday life during the war related to the book of F. Fischer (1960s). The prominent feature of the modern German historiography is the collective works. The Belarusian lands during WWI remain largely out of academic interests of the German researches.*

*Key words: World War I; historiography; German East Europe policy; German occupation; Ober Ost; military administrations «Lithuania» and «Białystok-Hrodna».*

У савецкай гістарыяграфіі Першая сусветная вайна ўспрымалася ў непарыўнай сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі Лютаўскай і Кастрычнічкай рэвалюцый. Пазней «Вялікая вайна» была заслонена падзеямі Другой сусветнай вайны, вывучэнню якой у СССР надавалася вялікае патрыятычнае значэнне.

У адрозненне ад нацыянальных гістарыяграфій краін Усходняй Еўропы, цікавасць да тэмы вайны 1914–1918 гг. у Германіі заўжды заставалася высокай. На працягу ста гадоў у сваіх даследаваннях нямецкія гісторыкі выкарыстоўвалі вялікі масіў архіўных крыніц, заканадаўчых і дакументальных крыніц, дакументаў асабістага паходжання, а менавіта ўспамінаў і крыніц эпісталярнага характару, публіцыстыкі, шматлікай перыёдыкі па шырокім коле праблем ваеннай і сацыяльна-эканамічнай гісторыі беларускіх тэрыторый перыяда акупацыі 1915–1918 гг., якія на працягу дзесяцігоддзяў не былі даступны айчынным гісторыкам.

Перад вайной 1914–1918 гг. у Германіі не было выдадзена ніводнай манаграфіі ці грунтоўнай публікацыі, прысвечанай беларускім землям. У нямецкіх навуковых і палітычных колах гэты край звычайна трактавалі як гаспадарча і культурна адсталую частку Расійскай імперыі, якая мела свае этнічныя і культурныя асаблівасці. Сучасны нямецкі даследчык Р. Ліндиэр у працы «Гісторыкі і ўлада» ацэньвае стан нямецкамоўнай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі так: «Слабае веданне гістарычных крыніц садзейнічала таму, што Беларусь перад 1918 г. у нямецкамоўнай гістарыяграфіі мела схематычны і абцяжараны міфамі вобраз»[1, S. 146].

Усталяванне летам 1915 г. акупацыйнага рэжыму на заходнебеларускіх землях паставіла перад нямецкім кіраўніцтвам задачу вывучэння занятых тэрыторый. Неабходнасць даследавання гаспадаркі, прыродных і людскіх рэсурсаў тлумачылася ў першую чаргу ваенна-эканамічнымі мэтамі. Падчас вайны былі выдадзены працы, прысвечаныя ваенным дзеянням на ўсходнім фронце [2–4]. Беларускія тэрыторыі трапілі ў поле зроку нямецкіх навукоўцаў і падтрыманых вайсковым ведамствам этнографаў, а таксама стала аб'ектам вывучэння для карэспандэнтаў перыядычных выданняў. На працягу 1915–1918 гг. выдадзены некалькі прац этнаграфічнага характару [5–13], якія былі падрыхтаваны па загаду адміністрацыі Обер Ост. Яны ўтрымлівалі інфармацыю гістарычнага, эканамічнага і краязнаўчага характару аб занятых землях. У кнізе «Польшча: развіццё і сучаснасць» асобны параграф быў прысвечаны гісторыі беларускага нацыянальнага пытання [14]. Найбольш вядомай у беларускай гістарыяграфіі стала праца «Беларусь: краіна, насельніцтва, гісторыя, гаспадарка, культура, мастацкая літаратура», выдадзеная пад рэдакцыяй В. Егера ў 1919 г. [15]. У снежні 1916 г. асобным зборнікам выйшаў збор артыкулаў з газеты «Grodnoer Zeitung» па гісторыі Гродна, які быў прысвечаны першаму году нямецкай улады ў горадзе (3 верасня 1915 – 3 верасня 1916 г.). У кнізе прадстаўлены невялікія артыкулы пра герб, замак, нямецкую царкву і могілкі, а таксама пра яўрэяў горада [16].

Першай абагульняючай працай, прысвечанай акупіраваным тэрыторыям, стала «Краіна Обер Ост. Нямецкая праца ў Курляндыі, Літве і Беластоку – Гродна», падрыхтаваная аддзелам прэсы пры Галоўнакамандуючым на Усходзе ў маі 1917 г. [17]. Нягледзячы на прапагандысцкія мэты выдання, кніга стала класічнай і да нашага часу не страціла сваёй навуковай значнасці. Яна ўключае гістарычную частку, дзе дастаткова падрабязна пададзены падзеі часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, і частку, у якой апісваюцца акупацыйная адміністрацыя, судовая, фінансавая і грашовая сістэмы, асноўныя мерапрыемствы ў сельскай і лясной гаспадарках, транспартнай палітыцы, гандлі і прамысловасці. Праца ўтрымлівае раздзелы пра царкоўныя справы, школьную адукацыю і культуру, а таксама статыстычныя даныя і карты. Частка кнігі «Замалёўкі з вобласці Обер Ост» аўтарства К. Румкера выйшла асобным выданнем пад назвай «Пытанні дэмаграфіі і населеных пунктаў у краіне Обер Ост» у 1918 г. [18]. Пазней выйшла яшчэ некалькі кніг, падрыхтаваных на аснове працы «Краіны Обер Ост» [19].

У 1917–1918 гг. групай нямецкіх навукоўцаў было падрыхтавана даследаванне ў 5 сшытках «Белавежская пушча ў нямецкай адміністрацыі», у якім ахарактарызавана выкарыстанне тэрыторыі, лясных багаццяў, праведзены аналіз жывёльнага, расліннага свету і геалогіі [20].

Гістарыяграфія перыяду вайны паўплывала на эвалюцыю вобраза Беларусі ў нямецкай навуковай прасторы. Калі да вайны беларускі народ альбо не выдзяляўся ў асобны, альбо надзяляўся ў навуковых працах паблажлівай ацэнкай як «народ беларусаў, заціснуты паміж палякамі, літоўцамі, вялікаросамі і маларосамі», які «не меў магчымасцей для свайго далейшага развіцця» [21, S. 67], дык падчас акупацыі сярод некаторых нямецкіх навукоўцаў з’явілася разуменне беларусаў як «адной з найстаражытнейшых культурных дзяржаў» [15, S. 51].

У 1920-х – першай палове 1930-х гг. афіцыйная нямецкая гістарыяграфія «Вялікай вайны» пісалася ў асноўным былымі ваеннымі, што прадвызначыла яе кансерватыўны характар. Работа Р. Хэпке «Нямецкая адміністрацыя ў Літве ў 1915–1918 гг.» была падрыхтавана на аснове справаздачы аб акупіраваных тэрыторыях для службовага карыстання [23–25]. У 1935 г. В. Каліяндар абараніў дысертацыю «Адносіны паміж Літвой і Германіяй падчас акупацыі 1915–1918» [22]. Г. Крон даследаваў гісторыю і арганізацыю нямецкай арміі ў гады Першай сусветнай вайны [26; 27].

Падрыхтоўка гітлераўскай Германіі да вайны з Савецкім Саюзам шмат у чым абумовіла зварот нямецкіх гісторыкаў да пытанняў, звязанных з акупацыйнай палітыкай падчас папярэдняга канфлікту. Так, у кнізе Г. Цемке прадстаўлены працэсы станаўлення адміністрацыі і тэрытарыяльнага падзелу, акрамя таго, у ёй змешчаны афіцыйныя заканадаўчыя дакументы, паводле якіх фарміравалася новая школьная сістэма на тэрыторыі Обер Ост [29]. Ф. Берткаў даследаваў перыядычны друк зоны Обер Ост [28]. Э. Энгельгарт

у рабоце «Беларусь: краіна і людзі», якая выйшла ў 1943 г., даў агляд гісторыі беларускага народа ў кантэксце развіцця яго дзяржаўнасці [30]. Асобную групу даследаванняў прадстаўляюць абагульняючыя працы гісторыкаў, прысвечаныя падсумаванню ведаў аб усходнееўрапейскіх землях часоў акупацыі ў Першую сусветную вайну [31–34]. У 1937–1941 гг. у Ляйпцыгу выдаваўся квартальнік «Ёмсбург. Народы і краіны на Усходзе і Поўначы Еўропы», дзе, сярод іншых, друкаваліся артыкулы аб развіцці беларускай палітычнай думкі і станаўленні дзяржаўнасці, а таксама аб тэрыторыях, якія знаходзіліся ў складзе зоны Обер Ост [35–37].

Пачаткам новага этапу вывучэння Першай сусветнай вайны стала праца гамбургскага гісторыка Ф. Фішэра «Памкненне да сусветнага панавання» [38], якая пабачыла свет у 1961 г. і выклікала ў ФРГ актыўныя дыскусіі [39–41]. У гэтым даследаванні даказвалася пераемнасць палітыкі Германіі з канца 80-х гг. XIX ст. праз Першую сусветную вайну да Другой. У кнізе Ф. Фішэр засяродзіўся на паглыбленым аналізе ўнутрыпалітычных прычын і асноў германскага экспансіянізму, яго рухаючых сіл і палітычных функцый [42]. Гісторык акцэнтаваў увагу на тым, што мэтай нямецкай «сусветнай палітыкі» было пераўтварэнне Германіі ў сусветную дзяржаву, і на гэтым шляху Германія планамерна рыхтавала вайну і сама распачала яе ў ліпені 1914 г. Галоўным вынікам дэбатаў вакол кнігі Ф. Фішэра стала абгрунтаванне неабходнасці вывучэння гісторыі Першай сусветнай вайны на аснове крытычнага аналізу шырокага спектра палітычных, эканамічных і сацыяльных прычын і фактараў, адлюстраваннем якіх была знешняя палітыка Германіі. У выніку ў заходнегерманскай гістарыяграфіі ў 1980-я гг. аформілася новая гістарыяграфічная парадыгма, паводле якой у цэнтр даследавання праблем вайны былі вынесены пытанні функцыянавання грамадства і штодзённага жыцця насельніцтва ў ваенны час. Адзначым, што адзін з артыкулаў Ф. Фішэр прысвяціў разгляду нямецкіх ваенных мэтаў на Усходзе і праблеме сепаратнага міру з Расіяй [43]. Упершыню спроба даследаваць нямецкую акупацыйную палітыку на Усходзе з пазіцый гісторыі штодзённасці была зроблена Г. Ліндэ ў манаграфіі «Германская палітыка ў Літве падчас Першай сусветнай вайны», якая выйшла ў 1965 г. [44]. Асноўным дасягненнем працы стала пастаноўка пытання пра рабаўнічы характар эканамічнай палітыкі ваеннага кіраўніцтва, а таксама характарыстыка становішча насельніцтва ва ўпраўленнях Літва і Беласток – Гродна акупацыйнай зоны Обер Ост. Даследчык В. Баслер у кнізе «Нямецкая анексіяністкая палітыка ў Польшчы і Прыбалтыцы» асвятліў планы Германіі на Усходзе, палітыку ў Польшчы і Балтыцы [45]. Але ні ў гэтай, ні ў іншых працах 1960-х гг. беларускія землі у складзе Обер Ост асобна не вывучаліся. Даследчыкі рабілі акцэнт на разглядзе агульных тэндэнцый усходняй палітыкі Германіі, а гісторыкі ГДР – на падзеях рэвалюцый у Расіі і пытаннях Брэст-Літоўскага мірнага дагавору [46–49].

У 1970-я гг. у зборніках па гісторыі Першай сусветнай вайны друкаваліся артыкулы ці дакументы, прысвечаныя пераважна гісторыі ваенных дзеянняў на

Заходнім фронце [50]. Выключэннем стала выданне матэрыялаў калоквіума «Да гісторыі БССР і нямецка-беларускіх адносін», які адбыўся 30–31 кастрычніка 1979 г. у г. Ена (Германія). У ім прымалі ўдзел гісторыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і універсітэта ім. Фрыдрыха Шылера. Сярод дакладаў вылучаюцца «Беларусь у планах нямецкага імперыялізма» (К. Рэмер), «Ваенная і ваенна-палітычная сітуацыя ў Беларусі ў 1916–1917 гг.» ( Х. Герч) [51].

Р. Цыльх у сваім даследаванні «Акупацыя і грашовае абарачэнне ў Першую сусветную вайну: нямецкая акупацыйная палітыка ў Бельгіі і Рускай Польшчы» (1994 г.) прыходзіць да высновы, што нямецкая палітыка дыктавалася эканамічнымі інтарэсамі ваеннага кіраўніцтва, якое разглядала акупіраваныя тэрыторыі выключна пад вуглом эксплуатацыі людскіх і матэрыяльных рэсурсаў. У аснове планаў нямецкай каланізацыі ляжала ідэя поўнага кантролю над усімі гаспадарчымі і транспартнымі шляхамі. Гісторык сцвярджаў, што ва ўмовах акупацыі ў сферу татальнага кантролю ваеннай улады траплялі гандаль, прамысловая вытворчасць, сельская і лясная гаспадаркі, але перш за ўсе фінансавыя аперацыі, поўны кантроль над якімі ажыццяўляўся праз ўвядзенне новай валюты. Гэта дазваляла кіраўніцтву на Усходзе ў некаторай ступені быць незалежнымі ад Берліна, што неабходна было для забеспячэння арміі і адміністрацыі на акупіраваных тэрыторыях.

Змены ў тэматыцы даследаванняў у сучаснай нямецкай гістарыяграфіі апісаў Б. Тос у артыкуле «Першая сусветная вайна як падзея і перажытае. Змена парадыгмы ў заходнегерманскім даследаванні Першай сусветнай вайны з часоў дыскусіі Фішэра» [53, S. 1012 – 1043]. Б. Тос падзяляе заходнегерманскую гістарыяграфію на чатыры этапы. Для першага з іх, які пачаўся ў міжваенныя гады, была характэрна ўвага да прычын вайны, падзей на франтах і вынікаў вайны. У 1960-я гг. у цэнтры грамадскай дыскусіі і навуковых даследаванняў апынуліся пытанні «ваеннай віны» і ваенных мэт Германіі. Трэці этап характарызуецца пачаткам даследавання сістэмнага крызісу Германіі ў перыяд кіравання Вільгельма II на аснове аналізу ўнутраных, эканамічных і грамадскіх перадумоў і наступстваў нямецкай палітыкі. Галоўнай тэндэнцыяй заключнага этапу стаў зварот да гісторыі штодзённасці і гісторыі грамадства.

У 1990–2000 гг. актуальнай формай вывучэння памераў і наступстваў «катастрофы дваццатага стагоддзя» сталі калектыўныя працы ў межах універсітэцкіх праектаў, у якіх аб’яднаны артыкулы аўтараў па вузкаму кірунку [53–56]. Многія сучасныя нямецкія аўтары аб’ядноўваюць трыццаць гадоў (1914–1945) у адзін перыяд глыбокага крызісу. Характэрнай асаблівасцю сучасных нямецкамоўных работ вялікіх і малых формаў стаў комплексны аналіз вывучаемай праблемы, які заключаецца ў разглядзе ваеннай гісторыі ва ўзаемасувязі з грамадскімі, сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі фактарамі.

Важнай навуковай праблемай для сучаснай нямецкай гістарыграфіі стала даследаванне ўплыву вайны для грамадства і палітыкі будучага развіцця Еўропы і света, а таксама яе ролі ў развязванні Другой сусветнай вайны.

Значнай падзеяй стаў выхад зборніка «Першая сусветная вайна. Другая сусветная вайна. Параўненне. Вайна, ваенныя вынікі і вопыт вайны ў Германіі», падрыхтаваны ваенна-гістарычным упраўленнем Бундэсвера пад рэдакцыяй Б. Тоса і Х. Э. Фолькмана [55; 57]. Нямецкія даследчыкі пачалі распрацоўваць новыя тэмы: К. Вестэрхоф – праблему прымусовай працы ва ўсходніх абласцях [58; 59], Р. Нахцігаль, Ё. Олтмэр, У. Хінц – выкарыстання працы ваеннапалонных на Усходнім фронце [60–62]. Да 100-гадовага юбілею «Вялікай вайны» нямецкімі гісторыкамі было падрыхтавана некалькі манаграфій аб пераасэнсаванні прычын, падзей і вынікаў вайны за апошняе стагоддзе [63–67]. У 2004 і 2014 гг. была выдадзена, а потым дапрацавана і перавыдадзена «Энцыклапедыя Першай сусветнай вайны» [72; 73]. Адзначым, што працы па выданні асобнай энцыклапедыі, прысвечанай Першай сусветнай вайне, не было праведзена ў іншых краінах-удзельніцах.

Шэраг артыкулаў і манаграфій прысвечаны гістарыяграфіі і метадалагічным праблемам ваеннай гісторыі [68–71]. Так, кніга М. Пёльмана «Ваенная гісторыя і гістарычная палітыка: Першая сусветная вайна: афіцыйная нямецкая гістарыяграфія 1914–1956 гг.» асвятляе ваенна-гістарычныя даследаванні і дзейнасць гісторыкаў перыяду вайны, адносіны паміж армейскімі структурамі і адэмічнай навукай, асаблівасці міжваеннага перыяду і перыяду Другой сусветнай вайны, асноўныя канцэпцыі і метадалагічныя падыходы. Змена метадалагічных падыходаў у нямецкай ваеннай гістарыяграфіі адбілася нават на назве самой галіны навукі. Да канца Другой сусветнай вайны выкарыстоўваўся тэрмін «гісторыя войн» («Kriegsgeschichte»), а ваенная гісторыя развівалася ў якасці раздзела ваеннай навукі, у якім даследаваліся выключна ваенныя падзеі і асобныя аперыцыі, біяграфіі выбітных ваенных дзеячаў. У рэчышчы гістарычнай навукі ваенная гісторыя актыўна пачала вывучацца толькі пасля 1945 г. Змяніліся метадалагічныя і крыніцазнаўчыя падыходы, кардынальна змяніўся прынцып падыходу да праблематыкі. Вайна перастала быць толькі канфліктам дзяржаў за тэрыторыю і рэсурсы, яна стала сацыяльным і культурным феноменам. У гістарыяграфіі паступова на першы план пачала выходзіць тэма чалавека на вайне і яго паўсядзённага жыцця. У той жа час пачаў выкарыстоўвацца тэрмін «ваенная гісторыя» («Militärgeschichte») [70, S. 15–17].

Асобныя даследаванні прысвечаны непасрэдна Беларусі. Так, у артыкуле «Ober Ost і нямецкая акупацыя Гародні ў Першую сусветную вайну паводле Дзённіка Курта Кламрота» М. Баціс на аснове дзённіка чыноўніка гарадской адміністрацыі вывучаў паўсядзеннае жыццё насельніцтва. Артыкул быў перакладзены на беларускую мову і стаў вядомы шырокаму колу беларускіх гісторыкаў [74]. Беларускі гісторык А. Смалянчук падрыхтаваў да публікацыі частку дзённіка [75].

Такім чынам, нямецкая гістарыяграфія займае значнае месца ў сістэме ведаў пра акупацыю Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Найбольш актыўна праблема даследавалася непасрэдна ў перыяд вайны і ў першыя гады пасля яе. Вывучаліся гісторыя і культура, рэлігія і нацыянальныя

ўзаемадачыненні, дэмаграфічныя характарыстыкі насельніцтва, а таксама прыродазнаўства, эканоміка акупіраваных тэрыторый. Сярод навейшых прац нямецкіх гісторыкаў пакуль адсутнічаюць спецыяльныя навуковыя даследаванні, прысвечаныя Беларусі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Lindner, R.* Historiker und Herrschaft. Nationsbildung und Geschichtspolitik in Weißrussland im 19.und 20. Jahrhundert / R. Lindner. – München: R. Oldenbourg, 1999. – 540 S.

2. *Niemann, H.* Hindenburg Siegeszug gegen Russland / H. Niemann. – Berlin: E. S. Mittler& Sohn, 1917. – 82 S.

3. *Wertheimer, F.* Hindenburgs Mauer im Osten / F. Wertheimer. – Stuttgart & Berlin: Deutsche Verl.-Anst., 1916. – 173 S.

4. Wie wir die westrussischen Festungen erobert haben: ein Beitrag zur Geschichte des Weltkrieges / von Oberst F. Immanuel. – 3. Aufl. – Berlin: E. S. Mittler& Sohn, 1916. – 66 S.

5. Das Litauen-Buch: eine Auslese aus der Zeitung der 10. Armee. 1918. – Wilna: Zeitung der 10. Armee, 1918. – 195 S.

6. *Eulenberg, H.* , Struck, H. Skizzen aus Litauen, Weissrussland und Kurland / H. Eulenberg, H. Struck. – Berlin: Drukerei des Oberbefehlshabers Ost G. Stilke, 1916. – 60 S.

7. *Gaigalat, W.* Litauen: das besetzte Gebiet, sein Volk und dessen geistige Strömungen / W. Gaigalat. – Frankfurt a. M.: Frankfurter Vereinsdrukerei, 1917. – 179 S.

8. *Kessler, O.* Die Baltenländer und Litauen / O. Kessler. – Berlin: Puttkammer & Muhlbrecht, 1916. – 237 S.

9. *Müller, E. F.* Statistisches Handbuch für Kurland und Litauen. Es sind statistische Mitteilungen über Westrußland: Brest–Grodno–Wilno–Wilejka–Lida–Slonim–Pruħany–Kobryn.– Jena: Gustav Fischer, 1918. – 209 S. – (Schriften des Instituts für Ostdeutsche Wirtschaft in Königsberg in Preußen).

10. *Ostmann, E.* Russlands Fremdvölker seine Stärke und Schwäche / E. Ostmann. – München, 1915. – 28S.

11. *Revelstein, H.* v. Die Not der Fremdvölker unter den russischen Jochen / H. v. Revelstein. – Berlin: G. Reimer, 1916. – 100 S.

12. *Schlichting, R.* Bilder aus Litauen: im Auftrage des Chefs und unter Mitarbeit zahlreicher Herren der Militärverwaltung Litauen / R. Schlichting. – Kowno: Kownoer Zeitung, 1917. – 168 S.

13. *Werbelis, K.* Russisch-Litauen: Statistisch-ethnographische Betrachtungen / K. Werbelis. – Stuttgart: J. Schrader, 1916. – 108 S.

14. Die Nationalitätenfragen: die Weissruthenen und die weissruthenische Frage // Polen: Entwicklung und gegenwärtiger Zustand. – Bern: Hallersche Buchdruckerei, 1918. – Kapitel XXIV. – S. 880–889.

15. *Jäger, W.* Weißruthenien: Land, Bewohner, Geschichte, Volkswirtschaft, Kultur, Dichtung / W. Jäger. – Berlin: Karl Curtius, 1919. – 143 S.

16. *Eisemann, H.* Druck- und Zeitungswesen in Grodno: nebst einem Anhang: Die älteste Ansicht von Grodno / H. Eisemann. – Grodno: Grodnoer Zeitung, 1916. – 15 S.

17. Das Land Ober Ost. Deutsche Arbeit in den Verwaltungsgebieten Kurland, Litauen und Bialystok-Grodno. – Berlin – Stuttgart: Verlag der Presseabteilung Ober Ost, 1917. – 472 S.

18. *Rümker, K.* v. Bevölkerungs- und Siedelungsfragen im Land Ob. Ost / K. v. Rümker. – Berlin: P. Parey; Verlag für Landwirtschaft, Gartenbau und Forstwesen, 1918. – 36 S.

19. *Häfner, E.* Wie werden die im Osten besetzten Teile verwaltet?: nach dem Buch «Das Land Ober-Ost» / bearb. von E. Häfner. – Berlin: Siegismund, 1918. – 48 S.

20. Bialowies in deutscher Verwaltung/ hrsg. von der Militärforstverwaltung Bialowies. – H. 1–5. – Berlin: P. Parey, 1917. – 351 S.

21. *Hettner, A.* Rußland: eine geographische Betrachtung von Volk, Staat und Kultur / von A. Hettner. – 2.Aufl. – Leipzig [u.a.]: Teubner, 1916. – 356 S.

22. *Colliander, B.* Die Beziehungen zwischen Litauen und Deutschland während der Okkupation, 1915–1918, Ph. D. Diss., Universität Abo, 1935 / B. Colliander. – 241 S.

23. *Häpke, R.* Die deutsche Verwaltung in Litauen 1915 bis 1918 / R. Häpke. – Berlin: Reichsdruckerei, 1921. – 225 S.

24. *Häpke, R.* Die geschichtliche und landeskundliche Forschung in Litauen und Baltenland, 1915–1918. / R. Häpke // Hansische Geschichtsblätter. – 1919. – № 45. – S. 17– 34.

25. *Skalweit, B.* Die Landwirtschaft in den litauischen Gouvernements: ihre Grundlagen und Leistungen / B. Skalweit. – Jena: G. Fischer, 1918. – 219 S.

26. *Cron, H.* Die Organisation des Deutschen Heeres im Weltkriege / H. Cron – Berlin: E. S. Mittler & Sohn, 1923. – 208 S.

27. *Cron, H*. Geschichte des Deutschen Heeres im Weltkriege 1914–1918 / H. Cron. – Berlin: K. Siegismund, 1937. – 407 S. – (Geschichte der Königlich Preußischen Armee und des Deutschen Reichsheeres. Bd. 5).

28. *Bertkau, F.* Das amtliche Zeitungswesen im Verwaltungsgebiet Ober Ost / F. Bertkau. – Leipzig: Emmanuel Reinucke,1928. – 105 S.

29. *Zemke, H.* Der Oberbefehlshaber Ost und das Schulwesen im Verwaltungsbereich Litauen während des Weltkrieges / H. Zemke. – Berlin: Junker und Dünnhaupt Verlag, 1936. – 120 S. – (Schriften der Kriegsgeschichtlichen Abteilung im Historischen Seminar der Friedrich – Wilhelms – Universität Berlin).

30. *Engelhardt E.* Weissruthenien: Volk und Land / E. Engelhardt. – Amsterdam–Prag–Wien–Berlin: Volk und Reich Verlag, 1943. – 496 S.

31. *Conze, W.* Agrarverfassung und Bevölkerung in Litauen und Weißrußland. T. 1. Die Hufenverfassung im ehemaligen Großfürstentum Litauen / W. Conze. – Leipzig: S. Hirzel,1940. – 247 S.

32. *Hölzle, E.* Der Osten im ersten Weltkrieg / E. Hoelzle. – Leipzig: Koehler & Amelang, 1944. – 243 S.

33. *Nithack, H.* Deutsche Arbeit in Polen und Litauen während des Weltkrieges / H. Nithack. – Berlin: Bund Deutscher Osten, 1939. – 29 S.

34. *Thielecke, A*. Deutsche landeskundliche Arbeit im Weltkriege an den europäischen Ost – und Südost-Front und in den anschließenden Etappengebieten, Ph. D. Diss., Friedrich-Schiller-Universität, Jena,1936 / A. Thielecke. – Eisfeld: C. Beck, 1936. – 185 S.

35. *Scheibert, P.* Der weissrussische politische Gedanke bis 1919 / P. Scheibert // Jomsburg. Volker und Staaten im Osten und Norden Europas: Vierteljahrschrift / hrsg. von J. Papritz u. W. Koppe. – Leipzig. – 1938. – H. 3. – S. 335–354.

36. *Scheibert, P.* Der Weg der Weissruthenen zur Weissruthenischen Sowjetrepublik / P. Scheibert // Jomsburg. Volker und Staaten im Osten und Norden Europas. – 1940. – H. 1–4. – S. 191–196.

37. *Stupperich, R.* Sieglungspläne im Gebiet des Oberbefehlshabers Ost (Militärverwaltung Litauen und Kurland) während des Weltkrieges / R. Stupperich // Jomsburg. Volker und Staaten im Osten und Norden Europas. 1941. – H. 3–4. – S. 348–367.

38. *Fischer, F.* Griff nach der Weltmacht: die Kriegszielpolitik des kaiserlichen Deutschland, 1914/18 / F. Fischer. – Düsseldorf: Droste, 1984. – 575 S.

39. *Fischer, F.* Kontinuität des Irrtums. Zum Problem der deutschen Kriegszielpolitik im Ersten Weltkrieg / F. Fischer. – Historische Zeitschrift. – 1961. – Bd. 191, H. 1. – S. 83–100.

40. *Fischer, F.* Weltmacht oder Niedergang: Deutschland im Ersten Weltkrieg / F. Fischer. – Frankfurt a. M.: Europäische Verlags-Anstalt, 1965. – 109 S.

41. *Lynar, E.* W. Deutsche Kriegsziele: 1914–1918; eine Diskussion / E. W. Lynar. – Frankfurt a. M.; Berlin: Ullstein, 1964. – 197 S.

42. В*иноградов, К. Б.* Фриц Фишер и его труды / К. Б. Виноградов // Новая и новейшая история. – 1988. – № 4. – С. 175–179.

43. *Fischer, F.* Deutsche Kriegsziele, Revolutionierung und Separatfrieden im Osten 1914–1918 / F. Fischer. – Historische Zeitschrift. – 1959. – Bd. 188. – H. 2. – S. 249–310.

44. *Linde, G.* Die deutsche Politik in Litauen im Ersten Weltkrieg / G. Linde. – Wiesbaden, Harrassowitz, 1965. – 265 S.
45. *Basler, W.* Deutschlands Annexionspolitik in Polen und im Baltikum 1914–1918 / W. Basler. – Berlin: Rütten&Loening, 1962. – 441 S.
46. *Baumgart, W.* Deutsche Ostpolitik 1918: von Brest Litowsk bis zum Ende des Ersten Weltkrieges / W. Baumgart. – Wien: R. Oldenbourg, 1966. – 462 S.
47. *Baumgart, W.* Brest-Litowsk / W. Baumgart, K. Repgen. – Gottingen: Vandenhoeck und Ruprecht, 1969. – 136 S.
48. *Epstein, F. T.* Die deutsche Ostpolitik im Ersten Weltkrieg / F. T. Epstein // Jahrbücher für Geschichte Osteuropas. – Stuttgart, 1962. – Bd. 10. – S. 381–394.
49. *Weber, H.* Ludendorff und die Monopole: deutsche Kriegspolitik 1916–1918 / H. Weber. – Berlin: Akademie-Verl., 1966. – 174 S.
50. Der Erste Weltkrieg. Dokumente. Schriften des Militärgeschichtlichen Institutes der DDR. Kleine Militärgeschichte. Kriege. Ausgewählt und eingeleitet von H. Otto und K. Schmiedel. – Berlin: Militärverlag der DDR,1977. – 416 S.
51. Zur Geschichte der BSSR und der deutsch–belorussischen Beziehungen. – Jena: Fridrich–Schiller–Universität, 1981. – 138 S.
52. *Zilch, R.* Okkupation und Währung im Ersten Weltkrieg: die deutsche Besatzungspolitik in Belgien und Russisch–Polen 1914–1918 / R. Zilch. – Goldbach: Keip,1994. – 431 S.
53. Der Erste Weltkrieg. Wirkung. Wahrnehmung. Analyse. Im Auftrag des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes hrsg. von W. Michalka. – München: Pieper Verlag, 1994. – 1062 S.
54. Die vergessene Front – der Osten 1914/15: Ereignis, Wirkung, Nachwirkung / im Auftrag des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes hrsg. von G. P. Groß. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2006. – 414 S.
55. Erster Weltkrieg. Zweiter Weltkrieg. Ein Vergleich. Krieg, Kriegergebnis, Kriegserfahrung in Deutschland. Im Auftrag des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes hrsg. von Br. Thoß, H. E. Volkmann. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2002. – 771 S.
56. *März, P.* Der Erste Weltkrieg: Deutschland zwischen dem langen 19. Jahrhundert und dem kurzen 20. Jahrhundert / P. März. (Berlin & Muenchen: Studien zu Politik und Geschichte; Bd. 1). – Stamsried: Ernst Voegel, 2004. – 308 S.
57. *Reimann, A.* Der Erste Weltkrieg – Urkatastrophe oder Katalysator?/ A. Reimann // Aus Politik und Zeitgeschichte. – 2004. – Bd. 29– 30. – S. 30–38.
58. *Westerhoff, C.* Deutsche Arbeitskraftpolitik in den besetzten Ostgebieten / C. Westerhoff // Zeitschrift für Regionalgeschichte über den Weltkrieg hinaus: Kriegserfahrungen in Osteuropa 1914–1918. – Lüneburg: Institut für Kultur und Geschichte der Deutschen in Nordosteuropa – Nord-Institut, 2009. – S. 83–107.
59. *Westerhoff, C.* Zwangsarbeit im Ersten Weltkrieg: deutsche Arbeitskräftepolitik im besetzten Polen und Litauen 1914–1918 / C. Westerhoff. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2012. – 377 S.
60. *Hinz, U.* Gefangen im Großen Krieg: Kriegsgefangenschaft in Deutschland 1914–1921 / U. Hinz. – Essen: Klartext-Verl., 2006. – 392 S.
61. Kriegsgefangene im Europa des Ersten Weltkriegs / hrsg. von J. Oltmer. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2006. – 308 S.
62. *Nachtigal, R.* Kriegsgefangenschaft an der Ostfront 1914 bis 1918: Literaturbericht zu einem neuen Forschungsfeld / R. Nachtigal. – Frankfurt am Main [u.a.]: Lang, 2005. – 162 S.
63. Der Erste Weltkrieg 1914 – 1918: der deutsche Aufmarsch in ein kriegerisches Jahrhundert / hrsg. M. Pöhlmann. – München: Bucher, 2014. – 382 S.
64. Erster Weltkrieg: globaler Konflikt – lokale Folgen; neue Perspektiven / hergst. St. Karner. – Innsbruck [u.a.] Studien Verl., 2014. – 488 S.
65. *Leonhard, J.* Die Büchse der Pandora: Geschichte des Ersten Weltkriegs / J. Leonhard. – München [u.a.]: Beck, 2014. – 1157 S.

66. *Mommsen, W. J.* Der Erste Weltkrieg. Anfang vom Ende des bürgerlichen Zeitalters / W. J. Mommsen. – Bonn: Fischer, 2004. – 220 S.

67. *März, P.* Nach der Urkatastrophe: Deutschland, Europa und der Erste Weltkrieg / P. März. – Köln [u.a.]: Böhlau, 2014. – 285 S.

68. *Hirschfeld, G.* Der Erste Weltkrieg in der deutschen und internationalen Geschichtsschreibung / G. Hirschfeld // Aus Politik und Zeitgeschichte. – 2004. – Bd. 29–30. – S. 3–12.

69. *Mommsen, W. J.* Der große Krieg und die Historiker: neue Wege der Geschichtsschreibung über den Ersten Weltkrieg / W. J. Mommsen. – 1. Aufl. –Essen: Klartext-Verlag, 2002. – 40 S.

70. *Pöhlmann, M.* Kriegsgeschichte und Geschichtspolitik: Der Erste Weltkrieg: die amtliche deutsche Militärgeschichtsschreibung 1914 – 1956. / M. Pöhlmann. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2002. – 421 S. – (Krieg in der Geschichte; Bd. 12).

71. Was ist Militärgeschichte? / hrsg. von T. Kühne und B. Ziemann. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2000. – 359 S.

72. Enzyklopädie Erster Weltkrieg / hrsg. von G. Hirschfeld [et al.]. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2004. – 1001 S.

73. Enzyklopädie Erster Weltkrieg / hrsg. von G. Hirschfeld [et al.]. – 2. Aufl. – Paderborn; München [u.a.]: Schöningh, 2014. – 1113 S.

74. *Баціс, М.* Ober Ost і нямецкая акупацыя Гародні ў Першую сусветную вайну паводле Дзённіка Курта Кламрота / М. Баціс // Гістарычны альманах. – Гродна, 2012. – Т. 18. – С. 42–73.

75. *Смалянчук, А. Ф.* Горадня 1916 г. на старонках Дзённіка ротмістра Курта Кламрота / А. Ф. Смалянчук // Горад Святога Губерта: зб. краязн. арт. / рэдкал.: А. Смалянчук [і інш.]. – Гродна, 2012. – Вып. 6. – С. 41–85.

**(Дата падачы: 19.02.2018 г.)**

*Т. В. Воронич*
Белорусский государственный экономический университет, Минск

*T. V. Voronich*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 336.14(476-21)(091)«18/19»**

## БЮДЖЕТЫ ГУБЕРНСКИХ ГОРОДОВ БЕЛАРУСИ НА РУБЕЖЕ XIX–XX ВВ.[1]

## BUDGETS OF THE PROVINCIAL CITIES OF BELARUS AT THE TURN OF THE XIX-XX CENTURIES

*Впервые на основе статистических документов Российской империи рассмотрены и проанализированы бюджеты пяти губернских городов – Вильны, Минска, Витебска, Гродно и Могилева на рубеже XIX–XX вв. Изучена динамика городских бюджетов с 1896 по 1913 гг. Детально исследованы доходные и расходные статьи бюджета, их удельный вес к общей сумме бюджета. Выбранные губернские города обладали крупными финансовыми средствами. Вместе с тем обремененность городов многочисленными казенными повинностями не позволяла решать ряд жизненно важных для городского населения проблем.*

[1] Текст подготовлен в рамках исследовательского проекта «Экология и санитарно-гигиеническая система Вильно, Ковно и Гродно в контекстах модернизации европейских городов в 1870–1914 годах», выполняемого при поддержке научного совета Литвы по программе «Модерновость в Литве» (Modernybė Lietuvoje). Проект № S-MOD-17-9.